**Зінкевіч, А.** «На вайне, як на вайне» / А. Зенкевіч // Веснік Глыбоччыны. — 1999. — 31 крас. — С. 2.

## «НА ВАЙНЕ, ЯК НА ВАЙНЕ»

**Леаніда Савельевіча Кірылава выклікалі ў райваенкамат. З'явіўся ў прызначаны час. А тут нечаканае: «Віншуем з узнагародай!». Разгубіўся былы воін-інтэрнацыяналіст, удзельнік афганскай вайны і на прапанову кіраўніцтва раённага ваеннага камісарыята ўручыць медаль «За адвагу» ва ўрачыстай абстаноўцы запратэставаў. Наадрэз адмовіўся, маўляў, навошта шуму нарабляць.**

Хваляванне перапаўняла сэрца, калі Леанід прымаў узнагароду. За нейкае імгненне ў памяці пранесліся суровыя дні вайны, згадаліся твары сяброў-аднапалчан. Успаміны пра гады службы не пакідалі яго ў той дзень. Дома даймалі сваімі дзіцячымі пытаннямі сын і дачушка:

– Тата, ну, раскажы, якія яны горы? А ці страшна, калі страляюць? Хто такія душманы?

Ледзьве паспяваў Леанід даваць тлумачэнні. Урэшце, медаль з бацькавых рук «перакачаваў» да сына. Немагчыма перадаць, якой радасцю і гонарам свяціліся вочы малога.

Яшчэ адно ўзрушэнне з нагоды ўзнагароджання медалём «За адвагу» давялося перажыць Леаніду Кірылаву. На ўрачыстым сходзе, прысвечаным 25-годдзю прадпрыемства, шматлікі калектыў Глыбоцкага камбікормавага завода віншаваў яго. Не вельмі ахвочы да вялікіх прамоў, што і змог тады, дык толькі падзякаваць за добрыя словы. Такі ўжо ён чалавек – Леанід Савельевіч Кірылаў – нешматслоўны, сціплы, стрыманы.

Больш 10 гадоў мінула з тае пары, як беларускі юнак з невялікай вёскі Сорыкі, што на Глыбоччыне, за праяўленыя мужнасць і гераізм пры выкананні баявога задання ў гарах Афганістана быў удастоены высокай узнагароды – медаля «За адвагу». Але па розных прычынах (развал СССР, крызісы і г.д.) не змог яе атрымаць. І толькі цяпер, якраз да 10-годдзя вываду савецкіх войск з Афганістана, узнагарода знайшла героя.

Служыць на чужыне Леаніду давялося ў складаны перыяд, з 1987 па 1989 год. Пасля «учебки» трапіў у асобны 345-ы дэсантны полк, які дыслацыраваўся ў правінцыі Баграм. Спачатку нёс службу па ахове складоў боепрыпасаў. Потым былі шматлікія аперацыі ў гарах, прыгожых, велічных і такіх няўтульных. Геаграфія ваенных дзеянняў вядомая: Саланг, Кундуз, Кандагар... А калі пачаўся паэтапны вывад нашых войск, асноўнай баявой задачай для Леаніда і яго сяброў з'яўлялася прыкрыццё адыходзячых калон ваеннай тэхнікі. Рэйды ў горы на БМП, высадка дэсанта з верталёта, засады і перастрэлкі, гарачыня і смага. Усё гэта было наяву.

– На вайне, як на вайне, – гаворыць Леанід. – Мы былі тады зусім маладыя. Ставала смеху і жартаў. Карацей, аптымізму не гублялі. Чакалі сустрэчы з роднымі, блізкімі, каханымі.

Леанід Кірылаў знаходзіўся ў складзе воінскіх злучэнняў, якія апошнімі выводзіліся з тэрыторыі Афганістана. За плячыма заставаўся цяжкі ваенны шлях, шлях гераічны. Сведчаннем таму з'яўляецца хаця б той жа медаль «За адвагу».

...Перад Леанідам і яго таварышамі была пастаўлена задача: замацавацца на апорным пункце ў гарах і прыкрываць рух нашых калон. Паднімаліся ў горы пад няспынным абстрэлам, уступалі ў бой з душманамі. І ўсё ж адолелі перашкоды і трымалі абарону больш двух месяцаў...

Адышла ў гісторыю афганская вайна. Шмат чаго памянялася ў свеце і на прасторах былой

вялікай краіны. Толькі нязменнымі застануцца гераізм і мужнасць колішніх салдатаў, сапраўдных мужчын, такіх, як Леанід Савельевіч Кірылаў. Не кожны дзень уручаюцца медалі «За адвагу». Падзея гэта значная і неардынарная. Шчыра віншуем нашага земляка з узнагародай, жадаем яму выдатнага здароўя і шчасця.

**Анатоль ЗІНКЕВІЧ**